Голас Радзімы

№ 44 (1306) ЛІСТАПАД 1973 г. ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ ГОД ВЫДАННЯ 18-ТЫ ЦАНА 2 КАП.

УЗНЯТАЯ СОТНЯЙ БРАТНІХ МОЎ

Беларускай літаратуры пашчасціла на ўвагу перакладчыкаў і іх сяброўскую прыхільнасць. У народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі ёсць верш, які так і называецца: «Сябрам-перакладчыкам».

Мастацтва роднай Беларусі,
Як выраслі шляхі твае,
Бо дзе я, дзе ні апынуся,
Я чую — Беларусь пяе...

Паэзіі і нашай крылы
Узняты сотняй братніх моў.
Не, мы яшчэ не ацанілі
Яе шматлікіх галасоў.

Тых галасоў, што загучалі
Праз вусны родных нам братоў —
На струны ўласныя паклалі
Іх шмат выдатнейшых майстроў.

Шмат выдатнейшых майстроў... Гэта не паэтычнае перабольшанне, а канстатацыя рэальнага факта. Вялікі пралетарскі пісьменнік Максім Горкі першы адкрыў рускаму чытачу гнеў і боль паэзіі Купалы, пераклаўшы яго верш «А хто там ідзе?». Беларускую паэзію перакладалі на рускую мову В. Брусаў, А. Пракоф'еў, М. Ісакоўскі, А. Твардоўскі, А. Ахматава, С. Маршак, М. Святлоў, Я. Смелякоў. Дзякуючы намаганням такіх выдатных рускіх перакладчыкаў, як Я. Хялемскі, М. Браун, М. Камісарава, А. Астроўскі, Б. Кежун, Д. Кавалёў, украінскіх — П. Тычына, М. Рыльскі, А. Малышка, М. Нагнібеда, літоўскіх — А. Венцлава, А. Жукаўскас, Э. Матузявічус, латышскіх — Я. Судрабкалн, Ю. Ванаг, Е. Стулпан і многіх, многіх іншых, беларуская літаратура шырока выйшла на ўсесаюзную арэну.

Перакладчыцкая праца, нялёгкая і складаная, але пачэсная і ганаровая справа, абмяркоўвалася на сімпозіуме перакладчыкаў беларускай літаратуры на мовы народаў СССР, які быў наладжаны ў Мінску праўленнем Саюза пісьменнікаў рэспублікі. На сімпозіум прыехалі вядомыя прапагандысты беларускай літаратуры з Масквы і Ленінграда, перакладчыкі з РСФСР, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Узбекістана, Грузіі, з іншых саюзных рэспублік, прадстаўнікі выдавецтваў краіны. У рабоце сімпозіума ўдзельнічалі беларускія пісьменнікі, вучоныя, работнікі выдавецтваў рэспублікі.

— Часы, у якія мы жывём,— сказаў, адкрываючы сімпозіум, старшыня праўлення СПБ, народны паэт Беларусі Максім Танк, — часы бурнага і нябачанага развіцця сацыялістычных культур, усё большага іх збліжэння і ўзаемаўзбагачэння.

— Цяжка пераацаніць, — адзначыў прамоўца, — значэнне для беларускай літаратуры працы нашых сяброў-перакладчыкаў. Бо якімі б ні былі выдатнымі нашы творы самі па сабе, без добразычлівага стаўлення, без высокага майстэрства перакладчыкаў, дарога гэтых твораў да савецкіх чытачоў не была б такой простай і шырокай.

— Пераклады твораў нашай літаратуры на рускую мову, якой зараз, паводле статыстыкі, карыстаюцца і якую вывучаюць каля паўмільярда чалавек на свеце, а таксама на мовы братніх народаў, як і пераклады іх твораў на беларускую мову, маюць велізарнае значэнне для развіцця нашай літаратуры, для ўмацавання нашай дружбы і інтэрнацыянальных сувязей.

— Зразумела, што ў першую чаргу мы павінны перакладаць усе тыя лепшыя творы, якія ўмацоўваюць веру ў веліч і высакароднасць нашай справы, пашыраюць нашы ідэйныя і мастацкія гарызонты і з'яўляюцца каштоўным укладам у нашу нацыянальную і агульную культуру.

Адной з мэт склікання сімпозіума было азнаямленне перакладчыкаў са здабыткамі беларускай літаратуры ў апошнія гады з тым, каб засяродзіць іх увагу на лепшых творах нашых празаікаў і паэтаў. Паведамленні аб сучасным стане беларускай прозы і паэзіі зрабілі літаратуразнаўца С. Андраюк і паэт М. Арочка.

Афіцыйныя даклады былі, зразумела, не адзінай крыніцай, адкуль госці маглі пачарпнуць звесткі аб новых творах, новых імёнах у беларускай літаратуры. У зале, дзе праходзілі пасяджэнні, была наладжана

(Заканчэнне на 7-й стар.)

Крэпасць над Бугам у легендарным 1941-ым абаранялі воіны Савецкай Арміі, прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Брэсцкая крэпасць стала сімвалам мужнасці і гераізму савецкіх людзей, дружбы яго народаў. Тут, на свяшчэннай зямлі Брэста, пабывалі ўдзельнікі сімпозіума перакладчыкаў.

Хлебам-соллю віталі сяброў-перакладчыкаў працоўныя Беларусі. У перапынку паміж пасяджэннямі адбываліся сяброўскія сустрэчы, шчырыя гутаркі. НА ЗДЫМКУ: А. ЯАКСОО (Талін), І. МЕЛЕЖ, І. ПТАШНІКАЎ і Т. РУЛІС (Рыга).

Фота У. КРУКА.

На Мінскім вытворчым аб'яднанні па птушкагадоўлі пабудавана новая сталовая для рабочых. Фота В. ДУБІНКІ.

✦

«ВІЦЕБСК» ЧАКАЕ ГАСЦЕЙ

Дзяржаўная камісія падпісала акт аб прыёме ў эксплуатацыю будынка гасцініцы «Віцебск». Ён узняўся на беразе Заходняй Дзвіны ў цэнтры горада. У 250 нумарах вышыннага дома змогуць адначасова пражываць 487 чалавек. Будаўнікі і праекціроўшчыкі пастараліся стварыць для іх максімум выгод. Гасцініца мае прасторны вестыбюль, рэстаран на 440 месц, буфет, пакоі бытавога абслугоўвання. Комплексам выгод забяспечаны жылыя нумары.

АБМЕРКАВАНЫ ПРАБЛЕМЫ АЎТАМАТЫКІ

У Мінску адбылася сёмая ўсесаюзная навукова-тэхнічная нарада па стварэнню і ўкараненню аўтаматызаваных сістэм кіравання тэхналагічнымі працэсамі і прадпрыемствамі. Яна была склікана Цэнтральным і Беларускім рэспубліканскім праўленнямі навукова-тэхнічнага таварыства прыборабудаўнічай прамысловасці, саюзнымі міністэрствамі прыборабудавання, сродкаў аўтаматызацыі і сістэм кіравання, вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, Дзяржаўным камітэтам стандартаў Савета Міністраў СССР і Дзяржпланам БССР.

У рабоце нарады ўдзельнічалі вядомыя вучоныя і спецыялісты, якія прадстаўляюць розныя галіны прамысловасці краіны, а таксама вучоныя з ГДР і ВНР.

Удзельнікі нарады абмеркавалі пытанні павышэння ўзроўню аўтаматызацыі кіравання, падзяліліся вопытам, намецілі меры для паскарэння распрацовак і ўкаранення АСК ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі.

ЗІМОВЫЯ АБНОЎКІ

Абнавілі асартымент зімовага адзення швейнікі Мінскага вытворчага аб'яднання імя Крупскай. Расшырылася, напрыклад, вытворчасць жаночых паліто са штучнага футра пад норку. Павышаным попытам карыстаюцца паліто з джэрсі з футравым каўняром, мужчынскія ўцепленыя паліто з пелаксу.

Значна абноўлены асартымент зімовага адзення для жанчын, дзяўчынак школьнага, дашкольнага і ясельнага ўзросту на Магілёўскай швейнай фабрыцы імя Валадарскага. У Оршы асвоены выпуск уцепленых паліто з футравым капюшонам для хлопчыкаў.

Усяго швейныя прадпрыемствы рэспублікі запусцілі ў вытворчасць каля 100 новых мадэлей зімовага адзення.

ЭВМ-ТЭХНОЛАГ

Электронна-вылічальная машына «Мінск-32» паспяхова замяняе многія абавязкі тэхнолага. Спецыялісты Талінскага політэхнічнага інстытута, напрыклад, даручылі ёй распрацаваць тэхналогію механічнай апрацоўкі турбіннай лапаткі.

Каб абучыць ЭВМ складаць такую дакументацыю, спецыялісты прааналізавалі вопыт «ручной» работы тэхнолагаў. Апісанне лапаткі пераклалі на матэматычную мову, а неабходны багаж ведаў—архіў канструктарска - тэхналагічных даных — запісалі на магнітную стужку і ўвялі ў памяць машыны.

Цяпер, «прачытаўшы» па перфастужцы зададзеныя канструктарам параметры, машына сама выбірае аптымальны парадак апрацоўкі загатоўкі, неабходнае абсталяванне і аснастку. Поўны комплекс тэхналагічнай дакументацыі рыхтуецца за гадзіну. Адзін тэхнолаг спраўляўся з такой работай за два месяцы.

Жывёлагадоўчы комплекс калгаса «За Радзіму» Кобрынскага раёна разлічаны на ўтрыманне 6 тысяч свіней. Сёлета будаўнікі здадуць комплекс у эксплуатацыю.

НА ЗДЫМКУ: мантажнікі А. ЗЯЛІНСКІ, П. ДРУГАК і І. ДЗЕРАЎНЮК устанаўліваюць адзін з транспарцёраў. Фота В. ГЕРМАНА.

«ПЕРЫФЕРЫЙНАЙ» НАВУКІ НЯМА

З кожным годам мяняецца геаграфія навукі ў Беларусі. Аб значэнні гэтай тэндэнцыі расказвае намеснік старшыні Дзяржплана Беларускай ССР Леў МЯТЛІЦКІ ў гутарцы з карэспандэнтам Агенцтва друку Навіны Дзмітрыем МІХАЙЛАВЫМ.

— Ці можна сцвярджаць, што Мінск — ужо не адзіны навуковы цэнтр Беларусі?

— Толькі за апошнія сем гадоў у Беларусі з'явіліся 24 новыя навуковыя ўстановы, і агульная колькасць іх дасягнула 180. Мінск па колькасці вучоных і навуковых інстытутаў усё яшчэ намнога апярэджвае іншыя гарады рэспублікі. У той жа час па асобных напрамках даследаванняў Мінск ужо не мае «манаполіі». Напрыклад, у 1970 годзе ў Гродна адкрыты Аддзел рэгуляцыі абмену рэчываў Акадэміі навук БССР. Гродзенскія вучоныя вывучаюць складаны механізм уздзеяння вітамінаў на абмен рэчываў і стан жывога арганізма. Гэтыя пытанні актуальныя для ўстанаўлення хуткіх і дакладных дыягназаў захворванняў, іх прафілактыкі і лячэння. Біяхімікі Гродна сталі прыкметнай навуковай сілай не толькі ў рэспубліцы, але і ў маштабе ўсёй краіны. Яшчэ большай вядомасцю карыстаецца створаны ў 1969 годзе ў Гомелі Інстытут механікі металапалімерных сістэм АН БССР.

— Ці не лепш усе навуковыя сілы рэспублікі сканцэнтраваць у адным «мазгавым цэнтры»?

— Не, не лепш. Вядома, што навука становіцца непасрэднай прадукцыйнай сілай. Ад яе залежыць, ці будуць задаволены рэзка ўзросшыя ў апошнія гады патрабаванні да тэмпаў тэхнічнага прагрэсу. Таму сённяшняя навука непазбежна бывае звязана з вытворчасцю. Для гэтага яе геаграфія павінна адлюстроўваць размяшчэнне прадукцыйных сіл.

Прамысловая вытворчасць у рэспубліцы планамерна разгрупоўваецца. Мэта — больш рацыянальнае выкарыстанне працоўных, сыравінных і энергетычных рэсурсаў. Практычна ўсё новае прамысловае будаўніцтва цяпер вядзецца ў сярэдніх і малых гарадах. Толькі ў гэтай пяцігодцы будуць пабудаваны буйны нафтаперапрацоўчы завод у Мазыры, яшчэ адзін калійны камбінат у Салігорску, шынны камбінат у Бабруйску, завод аўтаматычных ліній у Баранавічах, завод электрарухавікоў у Лунінцы.

— Якая роля Дзяржплана рэспублікі пры вызначэнні размяшчэння навуковых устаноў?

— Мы выстаўляем і падтрымліваем абгрунтаваныя прапановы аб стварэнні навуковых устаноў, іх філіялаў і праблемных лабараторый за межамі Мінска. У пяцігадовых і гадавых планах выдзяляем неабходныя сродкі для вытворчай і эксперыментальнай базы новых навуковых устаноў.

У 1973 годзе будзе закончана будаўніцтва спецыяльнага канструктарскага бюро з доследнай вытворчасцю для Інстытута механікі металапалімерных сістэм у Гомелі. У наступным годзе будзе пабудаваны вялікі лабараторны корпус Магілёўскага філіяла фізіка-тэхнічнага інстытута.

— Якія пры гэтым даводзіцца вырашаць праблемы?

— Самае важнае — дабіцца, каб «перыферыйная» навука ні ў чым не ўступала сталічнай. Натуральна, у першую чаргу гэта залежыць ад кадраў. У кожным выпадку гэту праблему даводзіцца вырашаць па-свойму. Напрыклад, у Гомелі Інстытут механікі металапалімерных сістэм перыядычна папаўняецца выпускнікамі Гомельскага універсітэта. А Магілёўскі філіял фізіка-тэхнічнага інстытута можа цвёрда разлічваць на мясцовы машынабудаўнічы інстытут. Пры гэтым развіццё навукі ў такіх гарадах у сваю чаргу дабратворна ўплывае і на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у мясцовых вышэйшых навучальных установах.

— Якія перспектывы на будучыню?

— Першачарговай задачай мы лічым узмацненне эксперыментальнай базы ўжо існуючых навуковых інстытутаў. У перспектыўных планах Акадэмія навук Беларусі мяркуе стварыць інстытут крышталяў у Віцебску, інстытут оптаэлектронікі ў Магілёве, інстытут геафізікі ў Плешчаніцах. У Гомелі намечана адкрыць філіял інстытута матэматыкі, а ў цэнтры беларускай нафтахіміі Полацку — філіял інстытута фізіка-арганічнай хіміі.

Цяпер на парадку дня стаіць стварэнне праблемнай навукова-даследчай лабараторыі Беларускага Паазер'я на поўначы рэспублікі ў Віцебску. Тут будуць вывучацца актуальныя пытанні аховы жывёльнага свету, асваення і рэканструкцыі гэтага азёрнага краю.

ТЭМПЫ АПЕРАДЖАЛЬНЫЯ

Прамысловасць Беларускай ССР у трэцім годзе пяцігодкі развіваецца апераджальнымі тэмпамі. План рэалізацыі прадукцыі за 9 месяцаў выканан на 102 працэнты. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года прырост прамысловай вытворчасці склаў 10 працэнтаў.

Гэтыя і іншыя лічбы былі прыведзены Цэнтральным статыстычным упраўленнем БССР у паведамленні аб выніках выканання Дзяржаўнага плана прамысловасцю рэспублікі за тры кварталы года. Паведамленне было надрукавана ў цэнтральных беларускіх газетах. Аналіз паказчыкаў сведчыць, што паспяхова выконваецца галоўная арыентацыя года — дзякуючы інтэнсіўным тэмпам прыросту прамысловай вытворчасці ствараецца надзейная база для выканання планаў наступных гадоў пяцігодкі.

Асабліва высокімі тэмпамі развіваюцца такія вядучыя галіны народнай гаспадаркі, як хімічная і нафтахімічная, машынабудаванне і металаапрацоўка, энергетыка, а таксама вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, што дазволіла яшчэ шырэй укараняць у прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва індустрыяльныя метады ўзвядзення аб'ектаў.

Навукова-даследчыя, праектна-канструктарскія арганізацыі і прамысловыя прадпрыемствы шырока ўкараняюць у вытворчасць дасягненні навукі і перадавой тэхналогіі. Асвоен выпуск каля двухсот новых відаў вырабаў. Сярод іх новыя мадэлі металарэзных станкоў павышанай дакладнасці, аўтамабілі для работы ў разнастайных кліматычных умовах, электравымяральныя прыборы.

Выканан таксама план па сабекошту прамысловай прадукцыі і прыбытках. У параўнанні з трыма кварталамі мінулага года прыбытак у прамысловасці ўзрос на 20 працэнтаў.

В. УЛАДЗІМІРАЎ.

БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ
агляд навін

Барацьба за мір і бяспеку народаў хвалюе ўсё чалавецтва. Таму мільёны людзей добрай волі з увагай сачылі за работай Сусветнага кангрэса міралюбівых сіл. У Маскву прыехала 3 200 дэлегатаў са 144 краін. Яны прадстаўлялі амаль 1 100 палітычных партый, арганізацый і рухаў. Дзеля новых дзеянняў у імя міру, свабоды, міжнароднай бяспекі, абароны правоў чалавека, сацыяльнага прагрэсу, дзеля шчасця і даброт, якіх горача прагнуць людзі ва ўсіх краінах, сабраўся гэты самы буйны і знамянальны кангрэс няўрадавых арганізацый і міралюбівых сіл.

Працягваюцца пленарныя пасяджэнні, дыскусіі на XXVIII сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У Першым камітэце пры абмеркаванні пытанняў па марскому праву выступіў пастаянны прадстаўнік БССР пры ААН В. Смірноў, які выказаўся за ўзаемаразуменне, справядлівы і дзелавы падыход да вырашэння наспеўшых праблем. У ходзе агульнай дыскусіі ў Другім камітэце слова ўзяў прадстаўнік БССР Б. Кудраўцаў. Тэма яго выступлення — развіццё міжнародных эканамічных адносін, узаемавыгаднае супрацоўніцтва, неабходнасць садзейнічання краінам, якія сталі на шлях развіцця. Прамоўца асобна спыніўся на вялікіх дасягненнях сваёй рэспублікі, яе шматгаліновай прамысловасці, перавагах сацыялістычнай эканамічнай інтэграцыі. Пры абмеркаванні ў Трэцім камітэце пытання аб святкаванні ў снежні гэтага года 25-й гадавіны Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека выступіла прадстаўніца Беларусі М. Карпенка.

З падзей мінулага тыдня ў сталіцы нашай рэспублікі варта адзначыць адкрыццё новай экспазіцыі ў выставачнай зале Гандлёва-прамысловай палаты БССР.

— Ваш горад быў рэкамендаваны нам Маскоўскім навукова-даследчым інстытутам будаўнічых машын і інструмента, таму што ў Мінску жыллёвае будаўніцтва вядзецца найбольш інтэнсіўнымі метадамі, — сказаў у гутарцы з журналістамі дырэктар заходнегерманскай фірмы «Путцмайстар» Харальд Цымерман. «Сучаснае абсталяванне для бетонных, тынкавачных і аддзелачных работ у будаўніцтве» з ФРГ дэманструецца ўпершыню ў Савецкім Саюзе. Беларускія спецыялісты змогуць не толькі паглядзець экспанаты на стэндах, але і ва ўмовах эксплуатацыі на адной з новабудоўляў горада.

Абмен навукова-тэхнічнай інфармацыяй усё часцей адбываецца не толькі ў час выставак, нарад, сімпозіумаў. Дэлегацыя Мінскага станкабудаўнічага завода на працягу двух тыдняў знаёмілася з работай Сілісцерскага завода металарэзных машын у Балгарыі. У мінулым годзе ў Мінску былі балгарскія спецыялісты. У якасці сяброўскага падарунка маладыя станкабудаўнікі Мінска вырабілі для калег з НРБ звышпланавы металарэзны станок. Эканамічнае супрацоўніцтва пераходзіць у брацкую дружбу.

АГРА-ГАРАДЫ НА МЕСЦЫ БАЛОТ

Гэтыя зярняты, што лашчаць далоні хлебароба, вырашчаны на былых балотах. Меліярацыя ператварыла багну ва ўрадлівыя палі. Наступленне на палескую дрыгву працягваецца. Другі здымак зроблены ў Ганцавіцкім раёне. Лемяхі плуга ўзорваюць зямлю, на якую раней не ступала нага чалавека.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

Меліярацыя сёння разглядаецца як асноўны сродак карэннага паляпшэння глебы і паскарэння тэмпаў развіцця сельскай гаспадаркі. Меліярацыя беларускага Палесся аб'яўлена Усесаюзнай ударнай камсамольскай будоўляй.

Вось што расказаў нашаму карэспандэнту начальнік трэста «Галоўпалессеводбуд» Васіль ЯРОМЕНКА:

— Велізарная гэта плошча — 2,2 мільёна гектараў. А нам яе трэба адваяваць у балот, каб яна закрасавала садамі, ураджайнымі палеткамі, сенажацямі. Кожны год калгасы і саўгасы атрымліваюць вялікія масівы новых зямель. Цяпер на беларускім Палессі асушана звыш 900 тысяч гектараў зямлі, на вялікіх плошчах пабудаваны асушальна-абвадняльныя сістэмы, рэканструяваны старыя асушальныя сеткі.

За два апошнія гады меліяратары здалі ў эксплуатацыю 120 тысяч гектараў адваяванай у балот цаліны. А наступленне працягваецца. Цяпер асваенне палескіх зямель вядзецца комплексна — расшыраюцца асушальна-абвадняльныя сістэмы і адначасова будуюцца вадасховішчы, рыбгасы, калгасныя і саўгасныя сажалкі.

— Васіль Васільевіч, як вырашаецца праблема назапашвання вады?

— Гэту праблему «Галоўпалессеводбуд» вырашае паэтапным меліярацыйным будаўніцтвам. Што гэта значыць? Спачатку ствараецца вадасховішча, адрэгулёўваецца вада ў рэках-водапрыёмніках. На другім этапе будуюцца асушальна-абвадняльныя сістэмы. Гэта практычна выглядае так: да моманту здачы таго ці іншага аб'екта ў эксплуатацыю будзе ўжо створана вадасховішча. Такія вялікія вадасховішчы, як «Чырвоная Слабада» на рацэ Марач і «Лактышы» на Лані, ствараюцца цяпер. Будуюцца таксама два штучныя вадаёмы. У наступным годзе пачнём стварэнне яшчэ чатырох вадасховішчаў. Сёлета колькасць іх будзе даведзена да 29.

— А якой вы бачыце будучыню Палесся?

— Пра будучыню можна не толькі гаварыць, але і пабываць у ёй сёння. Вось апорна-паказальны саўгас «Малеч». Праўда, узнік ён не на голым месцы, тут была пэўная база. Аднак як непазнавальна змяніўся ён за апошнія гады! Тут адбылася карэнная рэканструкцыя: пабудаваны выдатныя жывёлагадоўчыя комплексы, у цэнтры саўгаса вырасла шмат жылых і культурна-бытавых будынкаў, узводзяцца клуб на 600 месц, школа на 640 месц са спартыўным комплексам, дзіцячы садяслі, кафэ-рэстаран. У паркавай зоне гарадка будзе пабудаваны плавальны басейн. Будынак агульнаадукацыйнай школы прадугледжваецца пераабсталяваць пад музычную школу. А пабывайце ў кватэрах рабочых! Дабротныя, з ацяпленнем, гарачай вадой, каналізацыяй. Цэнтр саўгаса — гэта будучы аграгорад. Такія аграгарады вырастуць на Палессі.

— Паспяховае вырашэнне любых задач залежыць ад людзей. Якія кадры ў вас?

— За гады асваення палескіх зямель не адзінкі, а сотні меліяратараў сталі высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Дастаткова сказаць, што больш за 200 нашых работнікаў за працоўныя поспехі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

У «Галоўпалессеводбудзе» для падрыхтоўкі рабочых ёсць чатыры прафтэхвучылішчы на 1 650 месц, вучэбны камбінат на 320 месц, вучэбныя пункты ў кожным будаўніча-мантажным упраўленні, дзе штогод навучаюцца каля 2 тысяч рабочых.

БАНК РАВНЫХ ВОЗМОЖНОСТЕЙ

Миллиард переводных рублей. К этой цифре подошла стоимость объектов, кредитуемых Международным инвестиционным банком социалистических стран, или — как кратко его называют — МИБ.

МИБ не имеет многолетней истории, он существует третий год. Однако в финансовом мире его уже сейчас считают одним из крупнейших: уставной капитал МИБ — 1 052,6 миллиона переводных рублей. (Переводной рубль — коллективная валюта стран СЭВ, золотое выражение его равно 0,987412 грамма чистого золота).

Создатели МИБ — Болгария, Венгрия, ГДР, Монголия, Польша, Румыния, Советский Союз, Чехословакия. К началу 1973 года оплаченная часть уставного капитала банка составила 368 миллионов переводных рублей, в том числе 111 миллионов переводных рублей в конвертируемой валюте.

Банк главной своей целью ставит обеспечение тесного сотрудничества стран — членов СЭВ в совместном финансировании больших строительных программ.

Со времени создания банка число кредитуемых объектов достигло 29, а сумма кредита — 317 миллионов переводных рублей, в том числе 151 миллион переводных рублей в конвертируемой валюте.

Примечательным является то, что МИБ, осуществляя среднесрочное и долгосрочное кредитование, финансирует объекты, определяющие развитие научно - технического прогресса в странах — членах СЭВ. Так, предоставлен кредит в размере 77,5 миллиона переводных рублей сроком на 11 лет Чехословакии на модернизацию оборудования и увеличение производственной мощности завода «Татра». Кредит в сумме 38 миллионов переводных рублей сроком на 10 лет предоставлен Румынии на строительство завода изопренового каучука. Получают на различные сроки кредиты Болгария, Венгрия, ГДР, Польша.

Следует сказать, что размеры процентной ставки по кредитам в переводных рублях — 4—6 процентов годовых — значительно ниже ставок, принятых на валютных рынках капиталистических стран. Это не единственная отличительная черта МИБ от других банков. Его справедливо называют «Банком равных возможностей».

Председатель правления МИБ Виталий Воробьев, видный советский экономист, в беседе сообщил:

— Международный инвестиционный банк социалистических стран представляет собой международное кредитное учреждение, основанное на принципах полного равноправия и уважения суверенитета всех стран — членов банка. Это выражается в порядке решения вопросов и управления делами банка, в правах стран — членов. Общее руководство банком осуществляет Совет, в состав которого входят представители всех стран — членов. Каждая страна — член банка независимо от размера ее взноса в уставной капитал имеет в Совете один голос. В капиталистических инвестиционных банках страны — члены получают количество голосов пропорционально доле внесенных средств, в связи с чем крупные государства имеют преимущества при решении вопросов. Совет МИБ принимает решения единогласно по принятию новых членов, об увеличении уставного капитала, об утверждении годового отчета, о выпуске облигационных займов. По остальным вопросам — квалифицированным большинством не менее трех четвертей голосов. Банк является открытой организацией. В члены банка могут быть приняты и другие страны, разделяющие цели и принципы деятельности банка и готовые принять на себя обязательства, вытекающие из Соглашения об образовании Международного инвестиционного банка и его Устава.

Способствуя развитию национальных экономик стран — членов банка, МИБ тем самым поощряет развитие международной торговли.

Сенсацией в финансовом мире явилось принятие в этом году Советом МИБ решения о создании Специального фонда кредитования мероприятий по оказанию экономического и технического содействия развивающимся странам. Сумма фонда определена в 1 миллиард переводных рублей. Он начнет функционировать с 1 января 1974 года. Его деятельность будет направлена на развитие национальных экономик развивающихся стран, укрепление их экономической независимости, расширение на взаимовыгодных условиях внешне-экономических связей стран — членов банка с развивающимися странами. Фонд будет предоставлять кредиты на строительство новых предприятий, обеспечивающих высокую экономическую эффективность, а также на реконструкцию и модернизацию уже действующих.

Последнее заседание Совета МИБ еще раз показало, что Международный инвестиционный банк социалистических стран— действительно учреждение равных возможностей всех стран — членов. Прибыль банка за 1972 год составила 10 327,7 тысячи переводных рублей. Совет принял решение направить в резервный капитал 6 482,4 тысячи переводных рублей, остальная прибыль распределена между странами — членами банка.

Юрий ФЕДОРОВ,
экономический обозреватель АПН.

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

КІБЕРНЕТЫКА СЕЛЬСКІХ БУДОЎЛЯЎ

Вылічальны цэнтр створан у Міністэрстве сельскага будаўніцтва БССР. Ён аснашчаны ЭВМ «Мінск-32», якая здольна выконваць 65 тысяч аперацый у секунду. З дапамогай камп'ютэра ўкараняюцца эканоміка-матэматычныя метады кіравання будаўніцтвам, вырашаюцца інжынерныя задачы.

На цэнтральны дыспетчарскі пункт міністэрства, які мае разнастайныя тэхнічныя сродкі сувязі, сігналізацыі і ўліку, паступае аператыўная інфармацыя ад трэстаў, перасоўных механізаваных калон, з важнейшых аб'ектаў. Спецыялісты апрацоўваюць і аналізуюць гэту інфармацыю, кантралююць ход будаўніча-мантажных работ.

ЭВМ таксама разлічвае патрэбнасць у будаўнічых матэрыялах, вызначае найбольш рацыянальныя транспартныя схемы перавозкі жалезабетонных канструкцый, вырашае пытанні матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, будучага і перспектыўнага планавання, расшырэння сеткі будаўнічых арганізацый.

Стварэнне аўтаматызаванай сістэмы кіравання выклікана хуткім павелічэннем маштабаў будаўніцтва ў беларускіх сёлах. Міністэрства ў гэтым годзе, напрыклад, выконвае падрадныя работы на суму, якая перавышае чвэрць мільярда рублёў. Гэта на 60 мільёнаў рублёў больш, чым у 1970 годзе. Узводзяцца новыя добраўпарадкаваныя пасёлкі, буйныя збожжасховішчы і механізаваныя фермы, ільнозаводы і іншыя перапрацоўчыя прадпрыемствы, сотні школ, клубаў, бытавых камбінатаў.

Я. ГАЛКІН.

ПЕРШАЯ ПРАДУКЦЫЯ ЗАВОДА

К канцу дзевятай пяцігодкі перавозка пасажыраў трамваямі і тралейбусамі ў рэспубліцы павялічыцца на 33 працэнты. Адкрыецца тралейбусны рух у Гродна, паімчыцца скарасны трамвай у Наваполацку. Адначасова атрымліваюць далейшае развіццё дзеючыя паркі. Яны папаўняюцца камфартабельнымі машынамі, вагонамі вялікай умяшчальнасці. Вось асноўная мэта з'яўлення на індустрыяльнай карце Мінска яшчэ мала каму вядомай абрэвіятуры: «РТТЗ». Гэта рамонтны трамвайна-тралейбусны завод, пабудаваны непадалёку ад пасёлка Дражня ў Мінску.

Калі прадпрыемства выйдзе на праектную магутнасць, яно пачне штогод пастаўляць транспартным арганізацыям Беларусі шэсцьсот капітальна адрамантаваных вагонаў.

Нядаўна на ўчастку нестандартнага абсталявання выраблена першая прадукцыя новага завода.

Е. ЕТЧЫК.

Уступіў у строй яшчэ адзін корпус Беларускага політэхнічнага інстытута. Тут размясціліся лабараторыі аўтатрактарнага факультэта, кафедра графікі, базавая лабараторыя тэхнічных сродкаў навучання. Наш здымак зроблен у вылічальным цэнтры праблемнай лабараторыі інстытута.

ШЛЯХІ БАРАЦЬБЫ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ» У СЕРЫІ «МЕМУАРЫ» ВЫПУСЦІЛА КНІГУ ГЕОРГІЯ МУХА-МУХНОЎСКАГА «ШЛЯХІ-ДАРОГІ».

Было толькі два шляхі: або прыстасавацца да рэжыму акупантаў, якія «на крэсах» буржуазнай Польшчы прыгняталі беларускі народ, або ўключыцца ў барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Сын ганчара Георгій Муха выбраў шлях барацьбы.

Бацька, выбіваючыся з сіл, каб зарабіць на кавалак хлеба, стараўся даць дзецям адукацыю. Георгій вучыўся ў беларускай гімназіі ў Навагрудку. Часам, калі не было чаго есці, хлапец пешшу адпраўляўся ў роднае мястэчка Мір. А дома чуў ад бацькі: «Можа, хопіць вучыцца, калі так цяжка? Усё, што можам, табе пасылаем. Дзе ўзяць больш? Не пайду ж я красці». Але раніцай, пацалаваўшы руку маці і закінуўшы на спіну катомку з прадуктамі, хлапец зноў мераў крокамі няблізкі шлях.

Аднойчы ў кішэні свайго паліто Георгій знайшоў камуністычную газету «Чырвоны штандар». Хто паклаў яе? А калі гэта правакацыя? Тым, хто чытаў і распаўсюджваў нелегальную літаратуру, пагражала турма. Газета зрабіла на яго вялікае ўражанне. З большай увагай пачаў прыглядацца да таварышаў па гімназіі, да ўсяго, што акружала.

Чаму беларусы жывуць так бедна? Чаму лепшыя землі аддаюць былым польскім легіянерам, а сялян насуперак іх жаданню перасяляюць на хутары? Гэтыя і іншыя пытанні юнак задаў выкладчыку гімназіі. Адказу, зразумела, не атрымаў. А праз некалькі дзён Георгія выклікалі ў паліцыю: данёс нехта з гімназістаў.

Але вось закончана вучоба. Убачыўшы паперу з залатымі літарамі, якая сведчыла, што сын скончыў гімназію, маці заплакала. Задаволены і бацька. Але што далей? Ісці ў вучні да шаўца ці сталяра? Выпускнікоў беларускай гімназіі ў інстытуты не прымалі. Трэба было

ОТВЕТ СОВЕТСКИХ УЧЕНЫХ

ПРЕЗИДЕНТУ НАЦИОНАЛЬНОЙ АКАДЕМИИ НАУК США ДОКТОРУ Ф. ХЭНДЛЕРУ

В советской печати было опубликовано письмо членов Академии наук СССР, осуждающее поведение академика А. Сахарова.

В связи с этим в адрес президента Академии наук СССР академика М. Келдыша поступило письмо совета Национальной академии наук США, подписанное ее президентом Ф. Хэндлером. В этом письме наряду с общими рассуждениями о роли науки высказывалось недовольство позицией советских ученых в отношении А. Сахарова и, более того, была сделана попытка оказать политическое давление на советских ученых, ставя под сомнение возможность успешного развития научных связей между нашими странами.

Ниже публикуется ответ президиума АН СССР, подписанный президентом АН СССР академиком М. Келдышем, президенту Национальной академии наук США Ф. Хэндлеру.

Ознакомившись с Вашим письмом относительно, как Вы выражаетесь, судьбы А. Сахарова, я и мои коллеги по президиуму Академии наук СССР не можем не высказать решительного возражения по поводу его содержания и тона, не соответствующих ни существу дела, ни духу отношений между нашими академиями.

Мы не считаем нужным вдаваться сейчас в обсуждение содержащихся в Вашем письме общих положений о роли науки в современном мире, о ее глобальном характере, об этике ученого, об общих ценностях и т. п. Некоторые из этих положений сами собой очевидны и бесспорны, с другими мы согласиться не можем. Однако дело совершенно не в этом.

В своем письме Вы изображаете дело так, будто бы советские ученые осуждают Сахарова за его «вклад в дело прогресса человечества», «дух свободного научного поиска». Это явное искажение действительных мотивов в позиции советских ученых. Члены Академии наук СССР критикуют Сахарова за то, что он, по существу, выступил против разрядки напряженности и закрепления позитивных сдвигов в международной жизни, против нормализации отношений между западными странами и Советским Союзом. Более того, он призывает к тому, чтобы Запад шел на улучшение этих отношений только при условии принятия Советским Союзом ряда ультимативных требований, касающихся суверенных прав советского народа. А. Сахаров оклеветал советскую действительность и цели нашей страны в области международных отношений, приписав ей агрессивные намерения. Подобными действиями академик А. Сахаров наносит вред интересам не только Советского Союза, но и народов других стран, искренне стремящихся к разрядке напряженности, к международному сотрудничеству. До какого политического ослепления дошел Сахаров — в этом весь мир недавно имел случай убедиться, когда он назвал полосу террора, развязанного фашиствующей хунтой в Чили, «эпохой возрождения и консолидации».

И после этого Вы предлагаете нам, советским ученым, не осуждать действия Сахарова и, более того, взять его под свою защиту. Скажем прямо, мы считаем эти Ваши претензии несостоятельными и продолжать переписку на этот счет было бы бесполезно.

Ведь вопрос не в том, пользуется ли Сахаров интеллектуальной свободой, — сомнений в этом нет, —а в том, как и в каких целях он ее использует.

Как известно, Сахаров никаким притеснениям не подвергался и не подвергается. У него и сегодня имеются все возможности для активной научной деятельности. И если в последнее время он фактически отошел от науки, то это произошло отнюдь не по чьей-то вине, а по его собственной воле. Поднятая же на Западе шумная кампания вокруг Сахарова, по нашему убеждению, выгодна лишь тем силам, которые хотели бы вернуть мир к печальным дням «холодной войны».

Нас, конечно, не удивило то, что в США и в некоторых других странах нашлись деятели, которым пришлись весьма по душе призывы Сахарова, и они не замедлили воспользоваться ими. Но мы верим, г-н Хэндлер, что американские ученые, во всяком случае их большинство, окажутся способными разобраться в том, где идет речь об интеллектуальной свободе, а где о конкретных действиях того или иного лица, в данном случае Сахарова, направленных против интересов не только своего собственного народа, но и интересов мира, интересов человечества в целом.

Мы, советские ученые, сознавая большую ответственность людей науки перед народами своих стран, перед всем человечеством, высоко ценим, как и все советские люди, начавшийся процесс разрядки международной напряженности, перестройки международных отношений на основе принципа мирного сосуществования государств с различными социальными системами и развития взаимовыгодных связей между ними. При этом должен, конечно, неукоснительно соблюдаться и другой важнейший принцип международного общения — невмешательства во внутренние дела друг друга.

Это касается и затронутого в Вашем письме вопроса о научных обменах и научном сотрудничестве между нашими странами. Активно развивая такие обмены с американскими учеными и будучи готовыми делать это и впредь, мы всегда считали и считаем, что дело это сугубо добровольное и представляющее одинаковый интерес для обеих сторон. Попытки же как-то использовать эти обмены для воздействия на политические позиции советских ученых совершенно бесперспективны, не говоря уже об этической стороне этого вопроса. Мы стоим за широкое развитие научного сотрудничества при условии взаимного соблюдения традиций и порядков, существующих в каждой стране.

Президент Академии наук СССР, академик М. КЕЛДЫШ.

ДО СКОРОЙ ВСТРЕЧИ

пішуць землякі

Получила номер «Голасу Радзімы», в котором была напечатана статья о пребывании в Минске нашей группы. Я показываю газету знакомым и буду хранить ее всегда, так как и поездка, и все, что связано с ней, мне очень и очень дорого.

Всем туристам понравился ваш красавец Минск, который мы покидали с сожалением. Особенно тяжело было уезжать из Белоруссии тем членам группы, у кого там оставались родные и близкие, с которыми они имели возможность встретиться. Ведь для многих туристов именно это главное. И мне тоже очень не хотелось покидать ваш город, но горечь расставания немного скрасилась тем, что в Москве меня ожидали родственники, приехавшие из Челябинска. Я увидела их впервые.

Домой мы вернулись благополучно. Теперь у нас только и разговоров о том, чтобы в ближайшее время снова поехать на Родину. Так что до скорой встречи!

С уважением

Зинаида ПОЛЕССКАЯ.

США.

ПРЫЕМНЫЯ ЎСПАМІНЫ

Мінуў роўна год з таго часу, як я са сваёй сям'ёй наведаў родную Беларусь, дарагія сэрцу мясціны, дзе праходзіла маё юнацтва.

Слоў не хапае, каб выказаць тую радасць, якую адчуў я ў час нашага знаходжання на Радзіме, тое хваляванне, калі паказваў сваім дзецям сцежкі-дарожкі, дзе я хадзіў і бегаў у дзяцінстве. Пабывалі мы і ў школе, у якой я калісьці вучыўся. Хадзілі на рэчку, дзе ў юнацтве я любіў слухаць салаўя і дзе вясной так цудоўна расцвітае чаромха! Былі мы і ў тым лесе, куды я калісь бегаў па грыбы і ягады.

Мне хацелася паказаць сваім дзецям як мага больш, каб усё гэта засталося ў іх памяці на доўгія гады.

Вельмі прыемна было заўважыць змены, што адбыліся ў маіх мясцінах. Як пахарашэла аблічча нашых вёсак: замест старэнькіх пахіленых хатак стаяць добрыя дамы! На месцы непраходнай багны—сенажаць. А на малаўрадлівых у мінулым землях сёння каласіцца выдатная збажына! Мая родная вёска Ламачына ператварылася ў сапраўдны сад!

А як змяніўся быт сялян! У хатах дастатак. У калгасах працуе шмат моладзі з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй.

Я глядзеў на ўсе гэтыя змены і думаў: а ці змагла б наша Беларусь, яшчэ зусім нядаўна бедная, дасягнуць такіх поспехаў без братняй дапамогі савецкіх рэспублік? Гэтае ж пытанне я задаваў не толькі сабе, але і многім аднавяскоўцам. І ў адказ чуў: «Не, братка. Хоць і працавітыя нашы людзі, але ж без дапамогі іншых народаў Савецкай краіны мы не дасягнулі б такога ўзлёту».

Вось аб чым успамінаю я сёння, у гадавіну майго наведвання роднай Беларусі.

Англія.

Віктар ГРЫДЗЮШКА.

яшчэ два гады вучыцца ў польскай гімназіі і атрымаць атэстат сталасці. Так закрываўся беларусам шлях да адукацыі.

Выйсце дапамаглі знайсці сябры. Яны расказалі, што ў Вільна «Беларускі нацыянальны камітэт» накіроўвае ў Прагу здольных да навукі беларускіх хлопцаў. Чэхаславацкі ўрад дае ім стыпендыю. Так Георгій Муха апынуўся ў Празе.

У кнізе «Пра бацьку» Лів Нансен Хеер, дачка вядомага нарвежскага палярніка і прагрэсіўнага дзеяча, расказвае пра тое, як многа зрабіў Фрыцьёф Нансен пасля першай сусветнай вайны, каб дапамагчы бежанцам з розных краін. «Урады абавязаны працягнуць ім руку дапамогі», — заклікаў Нансен, бо «стварылася небяспека, што эмігранты стануць сацыяльным і палітычным бічом Еўропы». Тады і нарадзіўся славуты «нансенаўскі пашпарт» і былі створаны фонды дапамогі эмігрантам, у тым ліку і на мэты адукацыі. Прага стала адным з цэнтраў, дзе эмігрантам прадастаўлялася пэўная магчымасць атрымаць адукацыю.

Але калі стварэннем дабрачынных фондаў абмяжоўвалася місія такіх высакародных людзей, як Нансен, то для тых, хто меў намер выкарыстаць эміграцкую моладзь, што вучылася ў Празе, у сваіх брудных мэтах, «работа» толькі пачыналася. Да гэткіх адносіліся і беларускія буржуазныя нацыяналісты, прыхільнікі так званай «Рады БНР», якая атабарылася ў Празе. Той самай «Рады», што 25 сакавіка 1918 года прыняла «ўстаўную грамату», абвяшчаўшую «незалежнасць Беларусі ад Савецкай Расіі» і накіравала кайзеру Вільгельму тэлеграму з падзякай за акупацыю Беларусі.

Аднак «ідэі» буржуазных нацыяналістаў не знаходзяць водгуку ў сэрцах дзяцей сялян, студэнтаў, прыбыўшых у Прагу з Заходняй Беларусі. Яны ведаюць, чаго можна чакаць ад памешчыкаў і капіталістаў, ад польскай буржуазіі, дагаджаць якой заклікалі нацыяналісты тыпу Янкі Станкевіча, старшыні «Беларускага студэнцкага саюза».

Вельмі хутка зразумеў антынародную сутнасць нацыяналістычных «дабрадзеяў» студэнт політэхнічнага інстытута Георгій Муха. Ён уступае ў «Марксісцкую групу», якая на справе з'яўлялася нелегальнай камуністычнай ячэйкай. Група вяла работу і ў «Беларускім студэнцкім саюзе». Яе ўплыў пашыраўся з кожным годам. Адчувальны ўдар па антысавецкай прапагандзе беларускіх буржуазных нацыяналістаў нанеслі Я. Купала, Ц. Гартны, М. Чарот і М. Зарыцкі, якія прыехалі ў Прагу па запрашэнню Таварыства «Чэхаславакія — СССР». Выступленні беларускіх пісьменнікаў, іх пераканаўчыя расказы пра жыццё ў Савецкай Беларусі развеялі нацыяналістычную хлусню і мелі вялікае ўздзеянне на моладзь.

Раскол адбыўся і ў самой «Радзе». Некаторыя «міністры» публічна заявілі аб сваім разрыве з ёю і выказалі жаданне вярнуцца ў Савецкую Беларусь.

Каб дапамагчы моладзі пасля заканчэння вучобы атрымаць савецкае грамадзянства і дазвол на ўезд у БССР, быў арганізаваны «Саюз студэнтаў грамадзян БССР». У Празе былі створаны таксама «Саюз студэнтаў грамадзян РСФСР» і «Саюз студэнтаў грамадзян УССР».

У 1925 годзе на тэрыторыі Заходняй Беларусі пад уплывам і кіраўніцтвам КПЗБ узнікае масавая рэвалюцыйная арганізацыя — Беларуская сялянска-рабочая грамада. Студэнты, у тым ліку і Муха, рвуцца на радзіму, каб уключыцца ў барацьбу. Але «Марксісцкая група» раіць ім закончыць вучобу, адначасова рыхтуючы сябе да рэвалюцыйнай дзейнасці.

У той жа час студэнты, якія апынуліся пад уплывам беларускіх буржуазных нацыяналістаў (такіх, як Мікола Абрамчык і іншыя), рыхтуюць сябе да падрыўной дзейнасці супраць Савецкага Саюза. Пазней Абрамчык за маркі, атрыманыя ў канцылярыі Гебельса, будзе выдаваць у Берліне газету «Раніца», а пасля разгрому гітлераўскай Германіі зойме «прэзідэнцкую пасаду» нябожчыка Захаркі.

Нарэшце, Георгій Муха атрымлівае дыплом інжынера. Ён можа вярнуцца ў буржуазную Польшчу, атрымаць нейкае, няхай не самае лепшае месца і жыць, як раіць нацыяналіст Янка Станкевіч, прыстасавальнікам. Бо і Станкевіч, і Захарка, і Абрамчык клапоцяцца толькі аб уласным дабрабыце, а словы пра лёс Бацькаўшчыны — шырма. Не такія, як яны, запаўняюць турэмныя камеры на «крэсах». За кратамі пакутуюць сапраўдныя барацьбіты за нацыянальнае вызваленне — камуністы. Георгій прыдзе ім на змену, працягне іх справу.

...Поезд Варшава — Негарэлае спыніўся на станцыі Гарадзея раніцай. Далей да дома пешшу. Там маці, сёстры. Бацька не дачакаўся — памёр. Заняўшы пасаду інжынера, Георгій мог бы аблегчыць лёс родных, але ён гаворыць маці:

— Прыехаў я для таго, каб змагацца з несправядлівасцю. Інжынерам працаваць не буду. Не хачу сваімі ведамі, сваёй работай умацоўваць уладу польскіх акупантаў. Наадварот, буду рабіць усё для вызвалення беларускага працоўнага народа.

У Вільні Георгія Муху накіроўваюць на работу ў Таварыства беларускіх школ (ТБШ). Праз гэту масавую арганізацыю пасля разгрому Грамады Камуністычная партыя Заходняй Беларусі вядзе работу ў масах. Хоць ТБШ і легальная, афіцыйна зарэгістраваная ўладамі арганізацыя, але шпікі не спускаюць вачэй з яе актывістаў.

— «Аховай» сваёй асобы мы заўсёды забяспечаны, — сумна жартуе Рыгор Шырма, у той час адзін з вядомых работнікаў ТБШ, калі Георгій гаворыць яму, што за ім увязаўся шпік.— Для старых работнікаў гэта не навіна. Давядзецца і вам прывыкаць.

На адрас ТБШ з усіх канцоў Заходняй Беларусі ідуць пісьмы з просьбай садзейнічаць адкрыццю беларускіх школ. Інструктары ТБШ выязджаюць на месцы, сустракаюцца з людзьмі, дапамагаюць ім змагацца за свае правы. Георгій з галавой уваходзіць у работу, для сябе, для асабістага жыцця не застаецца ніводнай хвіліны.

Рэакцыя пераходзіць у наступленне. У Гродна, Кобрыне, Слоніме, Лідзе, Гіружанах адбываюцца сутычкі з паліцыяй. Ёсць забітыя і раненыя. Арыштаваны абраныя ў сейм прадстаўнікі народа. Надыйшла чарга і Георгія. Двойчы «адпачываў» Муха ў Лукішках. Заставацца ў Вільні пасля двух арыштаў было немагчыма, і па рашэнні партыі Георгій Муха нелегальна пераходзіць польска-савецкую граніцу.

На гэтым заканчваецца кніга Г. Муха-Мухноўскага «Шляхі-дарогі», што выйшла напярэдадні 50-годдзя Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, якое шырока адзначаецца грамадскасцю рэспублікі. На старонках кнігі яе аўтар, былы член КПЗБ, расказвае пра сваіх таварышаў па барацьбе — П. Цвяткова, С. Бабровіча, С. Верамея і іншых, пра тых, хто самаадданым змаганнем наблізіў час вызвалення Заходняй Беларусі з-пад улады буржуазнай Польшчы і ўз'яднання з БССР.

Леанід ПРОКША.

СОНЦА, АТАМ, ЧАЛАВЕК

ЛІДЗІЯ СЯМЁНАЎНА сядзіць за сталом і нешта засяроджана піша.

— Вы трошкі пачакайце, я рэкамендацыю ў партыю дапішу адной харошай дзяўчыне.

У кабінеце ціха. Праз расчыненае акно льецца парная цеплыня. Будзе дождж. Шум гарадскі сюды не далятае. Лабараторыя ўбаку ад яго, на ўскраіне горада. Побач віварый — доўгія, нізкія будынкі, драцяной сеткай абгароджаны выгульныя дворыкі.

У пакой заглядваюць.

— Нарада праз дзесяць хвілін,— падымае вочы ад паперы Лідзія Сямёнаўна.— Перадайце ўсім.

Праз дзесяць хвілін у пакойчыку не хапае крэслаў. Іх прыносяць. Пачынаецца нарада — абмеркаванне і зацвярджэнне плана работы на наступны год. Называюцца тэмы... А я ўглядаюся ў твары гэтых людзей, што працуюць побач з прафесарам Чаркасавай.

Потым мне гаварылі яе вучні:

— Яна з тых, хто першы пракладае шлях для іншых. Стварыла нашу лабараторыю, стварыла кафедру біяхіміі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна,— так кажа Таццяна Міронава, кандыдат біялагічных навук, у хуткім часе — доктар.

— За дваццаць гадоў, што я з ёю працую, ні разу не сарвалася, не павысіла голас. Колькі яна свайго часу, сваіх думак аддала на дысертацыі кожнага! Больш як трыццаць яе вучняў, яе аспірантаў сталі кандыдатамі навук,—гаворыць Валянціна Фамічэнка, таксама кандыдат біялагічных навук, адна з самых даўніх супрацоўніц Лідзіі Сямёнаўны.

На імя прафесара Чаркасавай ідуць пісьмы з навуковага савета па праблеме радыяцыйнай біялогіі Акадэміі навук СССР, з Інстытута медыка-біялагічных праблем, Міністэрства аховы здароўя СССР, з Інстытута ядзернай энергетыкі БССР, з арганізацыйных камітэтаў розных міжнародных таварыстваў.

Яе запрашаюць прыняць удзел у рабоце кангрэсаў, з'ездаў, канферэнцый, сімпозіумаў у Маскве, Ленінградзе, Польшчы, Венгрыі, Чэхаславакіі, Італіі, Японіі, ЗША, Галандыі...

Яна едзе або пасылае сваіх вучняў.

Не так даўно лабараторыю наведалі доктар медыцыны і фармакалогіі Р. Ю. Марголіс і доктар фармакалогіі Р. К. Марголіс — прафесары Нью-Йоркскага універсітэта. Амерыканскіх вучоных цікавіла работа беларускіх біяхімікаў. А потым на сумесным пасяджэнні таварыства біяхімікаў і фізіёлагаў яны зрабілі даклад па выніках сваіх уласных даследаванняў.

Што ж гэта за лабараторыя, работы якой ведаюць вучоныя ва ўсім свеце? Лабараторыя, у якой працуюць усяго дзесяць навуковых супрацоўнікаў?

Наш дваццаты век — век атамнай энергіі. Амаль трыццаць гадоў назад атамная энергія заявіла аб сабе страшэнным выбухам бомбы ў Хірасіме. Загінуў горад, загінулі людзі, а тыя, што засталіся жыць, паміралі паступова. Паміралі ад прамянёвай хваробы, ад вялікай дозы радыяцыі.

Наш дваццаты век — век асваення касмічнай прасторы. У космас ляцяць на доўгі тэрмін даследчыя лабараторыі, ляцяць людзі. А каб даляцець да планеты Марс ды вярнуцца на Зямлю, трэба прабыць у космасе тры — чатыры гады. Гэта палёты будучага. Але вучоныя думаюць пра іх, рыхтуюцца да іх сёння.

На Сонцы, якому мы даверліва падстаўляем свае спіны на пляжы, тры — чатыры разы на год вучоныя фіксуюць успышкі. Кожная такая ўспышка пасылае на Зямлю павышаную дозу радыяцыі. Ад гэтай дозы нас абараняюць атмасфера і іанасфера. А калі працяглы час быць у касмічнай прасторы, гэта доза будзе адчувальнай.

Наш дваццаты век — век павышанай радыяцыі. Людзі штодзённа і непрыкметна сутыкаюцца з яе малымі дозамі. Гэтыя дозы складаюцца з таго, што трапляе на Зямлю з космасу, узнікае з-за радыяактыўнага распаду ў Зямлі. І немалая доля — вынік таго, што ўсё больш выкарыстоўваецца ў мірных мэтах — у прамысловасці, у медыцыне, у сельскай гаспадарцы атамная энергія.

Навуковая лабараторыя біяхіміі Інстытута фізіялогіі АН БССР, якой кіруе прафесар Чаркасава, вывучае хранічнае ўздзеянне на жывы арганізм малых доз радыяцыі, плюс павышаныя дозы, якія імітуюць успышкі на Сонцы.

Гэта праблема веку.

У лабараторыі, якую яна стварыла і якой кіруе, працуюць біяхімікі.

Біяхімія вывучае ўласцівыя жывой матэрыі і хімічныя працэсы, што ў сваім заканамерным спалучэнні складаюць абмен рэчываў, які ляжыць у аснове жыцця.

Як жа ўздзейнічаюць на жывы арганізм малыя дозы радыяцыі? І не проста на арганізм, а на галоўныя яго рычагі: на цэнтральную нервовую сістэму, на сардэчную мышцу, на гарманальныя залозы, якія ў сваю чаргу ўздзейнічаюць на мозг? Вось што вывучаюць Лідзія Сямёнаўна і яе таварышы.

Яны абпраменьваюць малымі дозамі жывёлін. Абпраменьваюць гадамі. І назіраюць. І робяць вывады. Потым не абпраменьваюць і таксама назіраюць, і таксама робяць вывады. Ужо семнаццаць гадоў.

Такой «старой» па гадах лабараторыі, якая займалася б гэтай праблемай, бадай, у нашай краіне няма.

Таму вялікую цікавасць выклікае работа калектыву лабараторыі і выдадзеныя ў нас манаграфіі: «Іанізуючыя выпраменьванні і абмен рэчываў» і «Біяхімія малых доз іанізуючых выпраменьванняў».

...Прыйшоў дактарант Аляксандр Маленчанка. Перад Лідзіяй Сямёнаўнай ужо ляжаў рукапіс яго дысертацыі. Яна гартае старонкі, нешта пытае. Ён адказвае. Размова прафесійная.

Тэма яго дысертацыі, калі яе перакласці на даступную нам, не біёлагам і не медыкам, мову, гучыць прыблізна так: «Наяўнасць урану ў тканках чалавека і ўплыў прыроднага урану на функцыі шчытападобнай залозы ва ўмовах Беларусі». Таксама важная праблема.

...Нарэшце застаёмся адны, І Лідзія Сямёнаўна расказвае пра сябе. І ў гэтым расказе ўражвае шлях, якім яна прыйшла ў навуку.

З дванаццаці гадоў—круглая сірата. Жыла то ў бабулі, то ў дзядзькі. Працавала з малых гадоў. Вучылася ў школе і давала ўрокі, каб купіць сукенку. Потым была рабочай, бракоўшчыцай на Дняпроўскім металургічным заводзе і марыла пра інстытут.

1928 год. Яшчэ краіна не паднялася з разрухі, а ўжо адкрываліся новыя інстытуты, набіралі студэнтаў. І Ліда Чаркасава стала студэнткай медыка-аналітычнага інстытута ў Адэсе. Пазней здольнай студэнтцы прапанавалі аспірантуру на кафедры калоіднай хіміі. А яна пайшла лабаранткай у інстытут біяхіміі, толькі што створаны пры Акадэміі навук Украінскай ССР.

У 1938 годзе яе мужу, прафесару Меражынскаму, прапанавалі кафедру біяхіміі ў Пермскім медыцынскім інстытуце. Яна стала асістэнтам кафедры хіміі стаматалагічнага інстытута. Абараніла кандыдацкую, эксперыментальную частку якой зрабіла яшчэ ў Кіеве, і загадвала кафедрай. Там іх, ужо траіх, з дачкой, школьніцай Святланай, застала вайна.

Эвакашпіталь. Паўтары тысячы ложкаў. Паўтары тысячы жыццяў. Кожнага трэба паставіць на ногі і як мага хутчэй. А калі куляй перабіта костка? Дактары лечаць, здаецца, усё ідзе добра: рана зацягваецца, хворы ходзіць. Яго выпісваюць, а праз нейкі час ён зноў вяртаецца ў шпіталь са свішчом—гнойнае запаленне касцявога мозгу.

Каб паспяхова лячыць такога хворага, трэба дасканала ведаць, якія біяхімічныя змяненні адбываюцца ў яго арганізме. Такія змяненні вывучала лабараторыя Лідзіі Чаркасавай. Працягвала яна гэту работу і пасля вайны ў Інстытуце аднаўленчай хірургіі для інвалідаў Айчыннай вайны.

Абараніла доктарскую дысертацыю: «Біяхімічная характарыстыка агнястрэльнага астэяміеліту». Напісала манаграфію «Біяхімія траўмы».

І да гэтага часу манаграфія выклікае вялікую цікавасць у вучоных. І да гэтага часу да яе, аўтара, звяртаюцца за парадай медыкі.

А яна займаецца ўжо зусім іншым: малымі дозамі хранічнай радыяцыі.

Г. ВАСІЛЕЎСКАЯ.

ПРЫВАТНАЯ БІБЛІЯТЭКА ХРАПТОВІЧАЎ

ГЭТАЯ БІБЛІЯТЭКА—найбольш вядомы і каштоўны прыватны кніжны збор дарэвалюцыйнай Беларусі. Існавала бібліятэка з другой паловы XVIII стагоддзя да 1913 года. Пачатак ёй паклаў граф Іаахім Храптовіч (1729—1812), высокаадукаваны для свайго часу чалавек (закончыў Віленскую акадэмію, потым вучыўся ў Германіі), які адыгрываў прыкметную ролю ў палітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага: быў міністрам замежных спраў, маршалкам галоўнага трыбунала, падканцлерам, а з 1793 года і канцлерам княства. І. Храптовіч—адзін з першых землеўладальнікаў Літвы і Беларусі, які, ідучы насустрач павевам капіталістычнага развіцця, спрабаваў весці памесную гаспадарку пановаму.

Збіраць кнігі Храптовіч пачаў яшчэ ў ранняй маладосці, балазе стан выдавецкай справы ў Польшчы XVIII стагоддзя спрыяў бібліяфілам і калекцыянерам. Амаль усе значныя выданні таго часу знайшлі сабе месца ў бібліятэцы Храптовіча. Шмат падарожнічаючы па Германіі, Італіі, Францыі, ён папаўняў сваю калекцыю. Пасля падзелаў Польшчы закрываліся многія каталіцкія кляштары (толькі ў аднэй Галіцыі, далучанай да Аўстрыі, іх было закрыта 150), і гэтым Храптовіч таксама карыстаўся. Калі ў 1768 годзе быў сасланы ў Калугу вядомы магнат Іосіф Залускі, частку яго багатай бібліятэкі купіў Храптовіч. Аднак яшчэ больш кніг трапіла ў Гродна, у іншыя гарады, і тут іх таксама набываў Храптовіч, як набыў ён і найбольш каштоўныя выданні з бібліятэкі рымскага кардынала Іосіфа Імперыяле, пушчаныя на продаж пасля яго смерці.

У бібліятэцы Храптовіча знаходзілася ўсё, што мусіла быць у кніжным зборы культурнага арыстакрата, прыхільніка французскіх асветнікаў XVIII стагоддзя: грэчаскія і рымскія класікі, класічная французская і італьянская літаратура, лепшыя філосафы і публіцысты таго часу. Але, зрэшты, не гэтыя кнігі стваралі славу бібліятэцы.

Грамадскі і палітычны дзеяч, І. Храптовіч вельмі цікавіўся гісторыяй Польшчы і ў сваёй калекцыі сабраў багата польскіх выданняў XVI—XVII і пачатку XVIII стагоддзяў. Са шмат якіх рукапісных дакументаў Храптовіч рабіў копіі (каля 150 рукапісаў), галоўным чынам з сеймавых і сеймікавых актаў, з каралеўскіх пісьмаў і г. д.

Шырока прадстаўлена ў зборы Храптовіча заходнееўрапейская літаратура эпохі Рэфармацыі: кнігі, карыкатуры, лістоўкі, пракламацыі і інш.

Пасля смерці І. Храптовіча бібліятэка перайшла да яго сына Адама, інспектара літоўскіх школ Віленскага універсітэта.

Бібліятэка знаходзілася ў Шчорсах (цяпер Навагрудскі раён). Каб ёю пакарыстацца, у Шчорсы часта прыязджалі такія выдатныя грамадскія і палітычныя дзеячы Польшчы, як Я. і А. Снядэцкія, Малеўскі, Лялевель, Даніловіч. Бывалі тут Міцкевіч, Адынец: вярнуўшыся з ссылкі, працаваў бібліятэкарам у Шчорсах Чачот.

Захаваліся датаваныя ліпенем 1902 года правілы карыстання калекцыяй Храптовіча: «Собрание Щорсовской библиотеки предоставляется для научных занятий как русских, так и иностранных ученых. Занятия производятся на месте в помещении, особо для сего назначенном. Отнюдь не в самой библиотеке. Одновременно одному лицу выдается на руки не более 10 томов печатных книг и 4-х томов рукописей. Высылка книг и рукописей за пределы Щорс производится только по ходатайству ученых учреждений, русских и иностранных».

У 1893 годзе бібліятэка перайшла да сына сястры Храптовіча — А. Буцянёва-Храптовіча, а пазней да яго сына К. А. Буцянёва, апошняга ўладальніка Шчорсаў, які перадаў бібліятэку Кіеўскаму універсітэту з умовай, што яна «вернецца», калі будзе заснаваны універсітэт у краі.

У Кіеўскі універсітэт было перададзена 4 500 тамоў, галоўным чынам на польскай мове. Грэчаская і французская літаратура засталася ў Шчорсах. Падчас першай сусветнай вайны ўся яна загінула. (Тое, што было ў Кіеўскім універсітэце, захавалася і было пазней, ужо ў савецкі час, перададзена бібліятэцы АН УССР).

У розных крыніцах прыводзяцца розныя звесткі аб колькасці кніг у шчорсаўскім зборы: адны называюць 12 тысяч тамоў, другія — 10 тысяч. Каталог бібліятэкі не быў апублікаваны.

Нам удалося адшукаць у Польшчы рукапісны каталог бібліятэкі Храптовічаў. У прадмове да каталога яго складальнік гаворыць, што апісаў толькі польскія выданні і кнігі пра Польшчу.

Было ў фондах Храптовіча і 126 кніг, надрукаваных у Вільні, Супраслі, Гродна і Полацку. Сярод іх «Флэра Літвы» Э. Жыльберта (Гродна, 1781), «Маніфест Богу, Свету і Айчыне» (Гродна, 1699), «Трон Айчыны, альбо палац вечнасці» А. Калідскага (Супрасль, 1727), два выданні Статута Вялікага княства Літоўскага (1694 і 1780), бібліі, царкоўныя хронікі, палемічныя выданні.

У бібліятэцы захоўвалася шмат сельскагаспадарчай і эканамічнай літаратуры (напрыклад, выдадзеная ў 1841 г. у Вільні «Палітычныя эканомія» А. Сміта), а таксама літаратура мастацкая (Шылер, Расін, Вальтэр і інш.) і, вядома, багаслоўскія кнігі. Звяртае на сябе ўвагу «Зборнік песень на вялікае свята народаў — рускага і польскага» (Кракаў, 1606).

Але прадметам найбольшай цікавасці І. Храптовіча была, паўтараем, гісторыя Польшчы, Літвы, Беларусі. Сярод гістарычнай літаратуры значнае месца займаюць палітычныя прамовы, геральдычныя зборнікі, гісторыі польскіх каралёў, літоўскіх і польскіх князёў, творы аб магдэбургскім праве, аб руска-польскіх адносінах.

Славутая бібліятэка Храптовічаў — помнік культуры Беларусі, і яе вывучэнне будзе весціся далей.

В. ЦЫБУЛЯ,
аспірантка Інстытута гісторыі АН БССР.

На пачатку вясны і лета, восені і зімы з'яўляюцца ў друку і на рэкламных шчытах аб'явы аб дэманстрацыі ў Мінскім доме мадэляў навінак сезона. Пакуль манекеншчыкі нетаропка праходзяць перад гледачамі, каментатар - мастацтвазнаўца расказвае пра вядучыя сілуэты сукенак і паліто, даўжыню спадніц, выкарыстанне аздабленняў, пра фактуру і колер модных тканін. Так, да зімовых паліто прапануецца футра з доўгім ворсам, рыжай або чарнабурай лісіцы, пясца. Моднымі дэталямі з'яўляюцца мяккія паясы, манжэты з футра, дэкаратыўная строчка, накладныя кішэні.

НА ЗДЫМКАХ: прапануе Мінскі дом мадэляў.
Фота М. ХАДАСЕВІЧА.

Птушыны абед.

Фотаэцюд У. КІТАСА.

Ад Белавежы да Сахаліна

НА ВЫПРАБАВАННІ — НОВЫ ЗЛАК

Сёлетняй восенню ў многіх абласцях Украіны і Расійскай Федэрацыі пачаліся дзяржаўныя выпрабаванні новага, штучна выведзенага злака.

Прафесар Андрэй Шулындзін з Харкава ўпершыню ў сусветнай практыцы сінтэзаваў у адным арганізме тры злакі: азімую цвёрдую пшаніцу, мяккую пшаніцу і жыта. Папярэднія даследаванні паказалі, што гэта якасна новая расліна абяцае стаць адным з перспектыўных відаў так званага трытыкале, над стварэннем якога працуюць селекцыянеры многіх краін свету.

Доследы з трытыкале (у гэтым лацінскім тэрміне пачатковыя літары ўзяты ад слова «пшаніца», а канчатковыя—ад слова «жыта») выклікаюць цікавасць не выпадкова: на думку многіх вучоных, гэта хлеб будучыні. «Па свайму біялагічнаму патэнцыялу, па ўраджайнасці трытыкале можа пераўзыйсці ўсе іншыя каласавыя культуры», — лічыць акадэмік Мікалай Турбін, прэзідэнт Усесаюзнага таварыства селекцыянераў.

Першыя намалоты трытыкале, створанага А. Шулындзіным і пасеянага на палях Украінскага навукова-даследчага інстытута раслінаводства, селекцыі і генетыкі, далі ўраджай амаль 62 цэнтнеры з гектара.

Новы злак утрымлівае 16—17 працэнтаў бялка (у пшаніцы—14—15), пераносіць халады на 3—3,5 градуса нізкі. Акрамя таго, ён устойлівы да спецыфічных хвароб традыцыйных збожжавых культур.

МУЗЕЙ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

Этнаграфічны музей-запаведнік, які аднаўляе карціну ўкладу і быту буратаў у дарэвалюцыйны перыяд, адкрыт у горадзе Улан-Удэ. Тут прадстаўлены драўляныя жылыя дамы XIX стагоддзя, нацыянальнае жыллё — юрта, гаспадарчыя пабудовы.

Асаблівую цікавасць наведвальнікаў выклікае макет аднаго з вядомых будыйскіх храмаў, што знаходзіцца пад аховай дзяржавы, а таксама тры чумы і загон для аленяў са стойбішча эвенкаў. На плошчы ў адзін гектар размясцілася таксама выстаўка разьбы па дрэве, экспанатамі якой з'яўляюцца распісаныя народным арнаментам вароты, брамкі, аконная ліштва, аканіцы і іншыя атрыбуты драўлянага афармлення дамоў.

КОКАНЫ НА КАНВЕЕРЫ

Узбекістан — адзін з буйнейшых у свеце вытворцаў шоўку. З кожным годам тут усё больш і больш атрымліваюць шаўковай сыравіны. Рашаючую ролю ў гэтым адыгрываюць спецыялізаваныя заводы па выкармцы шаўкапрада. Пастаянную дапамогу шаўкаводам аказваюць вучоныя.

— Выкормліванне шаўкапрада — справа надзвычай працаёмкая і клапатлівая, — гаворыць дырэктар Інстытута шаўкаводства Мукадас Ганіева. — Пражэрліваму вусеню неабходна вялікая колькасць лісця шаўкоўніцы (тутоўніку). Таму даследаванні вучоных вядуцца па двух напрамках — «удасканалення» самога вусеня і вывядзення высокаўраджайных сартоў шаўкоўніцы.

За апошнія 20 гадоў ва Узбекістане выведзена 30 новых сартоў тутоўніку з пышнай хуткарастучай кронай. У выніку селекцыі створаны і новыя пароды вусеняў — больш жыццяздольных і шаўканосных. Асаблівую ролю ў селекцыі шаўкапрада адыграла выкарыстанне радыеактыўных ізатопаў. Распрацаваны эфектыўныя метады прамысловай выкармкі шаўкапрада. Для гэтай мэты створана аўтаматычная лінія. Першыя ўзоры яе перададзены ў карыстанне калгасам і саўгасам рэспублікі.

ГУМАР

Жанчына, якой павінны зрабіць сур'ёзную аперацыю, звяртаецца да хірурга:

— Доктар, мне сказалі, што гэта аперацыя вельмі рызыкоўная, яна ўдаецца адзін раз з трох.

— Супакойцеся, мадам, дзве ўжо былі няўдалыя...

●

Вядомага спевака сябры запрасілі на абед. За дэсертам гаспадыня папрасіла яго праспяваць.

— З ахвотай, — згадзіўся той. — Але што скажуць вашы суседзі?

— А, кожнаму свая чарга. Іх сабака нам не дае спаць ноччу.

●

Гаспадар бара гаворыць аднаму пастаяннаму наведвальніку:

— Сёння я не магу прапанаваць вам каву. Яна скончылася.

— Не дзіўна. З кожным днём яна была ўсё слабей і слабей.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-65-84, 33-03-15, 33-65-91, 33-15-15.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. № 1251.